не богата»); *«Оставшимся – своя Голгофа, отъехавшим-своя тоска»* («– Как жили? – спросишь. Так и жили»).

Вторую группу имен собственных, которую мы выделили в сборнике «Спросите у земли», составляют антропонимы. Немалая часть антропонимов – это имена реальных лиц, среди которых много известных писателей, композиторов, исторических личностей, певцов. Например, *Карамзин*, *княгиня Ольга*, *Тютчев*, *Ольгерд*, *Огинский*, *Ефросинья* (Полоцкая), *Пушкин*, *Бах*, *Басков*, *Монтсеррат* и др.

В состав третьей группы имен собственных мы включаем слова, написание которых автор сближает с именами собственными, так как, на наш взгляд, они занимают очень важное место в творчестве Николая Наместникова и не могут остаться незамеченными. В эту группу включены такие слова: *Отчизна*, *Бог*, *Господь*, *Он*, *Родина*, *Ты*, *Отечество* и др. Наиболее часто (18 раз) в сборнике встречается оним *Бог: «Кровь, особенно если свежа, почему-то угодная Богу»* («Жертва»); *«Бог нас не рассудит – только спросит»* («Усмехнись, мой старый друг»). Чуть менее часто в сборнике стихов встречается оним Господь (14 раз): *«Чтоб невзначай не осерчал Господь: телам – земное, ну а души – с небом»* («Провинция»); *«Точно Господни меточки – светятся, не хоронятся»* («Яблоки»).

Особое место в поэзии Николая Наместникова занимает библейская тема. В сборнике можно встретить множество имен собственных, связанных с этой темой: *Мария*, *Пилат*, *Христос*, *Авель*, *Каин*, *Иуда*, *Ирод* и др. Наиболее часто среди этой группы имен собственных встречается оним Христос (10 раз): *«Хоть в красках он был мастак, но только кровь на ладонях Христа ему не давалась никак»* («Легенда о мастерах»); *«Она любила своего Христа, она к нему шагнула вниз с моста»* («Баллада о чуде»); *«Христос с почерневшей старинной иконы старухе поклоны бьёт»* («Щеки обвисли и посерели»).

**Заключение.** Таким образом, в сборнике «Спросите у земли» автор использовал 174 онима. Сборник стихов Николая Наместникова «Спросите у земли» представляет собой глубоко эмоциональное и философское сочинение, в котором автор обращается к вечным вопросам бытия, природы и человеческой судьбы. Через имена, географические названия Николай Наместников создает пространство для размышлений о человеческом бытии, судьбе и связи человека с окружающим миром. Дальнейшее исследование имен собственных в сборнике «Спросите у земли» может стать основой для будущего более глубокого анализа его творчества, а также для исследования функций имен собственных в других литературных текстах.

1. Наместников, Н.А. Спросите у земли: стихи / Н.А. Наместников. – Минск: Мастацкая літаратура, 2022. – 143 с.

## ЭВАЛЮЦЫЯ ЎРБАНІСТЫЧНАЙ ТЭМЫ Ў ЧЭШСКАЙ ПАЭЗІІ ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XX СТ.

***Шлемен Ю.А.,***
*аспірант другога года навучання, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*малодшы навуковы супрацоўнік ЦНБ НАН Беларусі,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік – Вострыкава А.У., канд. філал. навук, дацэнт*

Ключавыя словы. Чэшская паэзія XX ст., эвалюцыя ўрбаністычнай тэмы, пралетарская літаратура, паэтызм, сюррэалістычны кірунак.

Keywords. Czech poetry of the XX century, the evolution of urban themes, Proletarian literature, poetics, surrealist trend.

Для чэшскай літаратуры традыцыйны вобраз горада – гэта адлюстраванне гістарычнага мінулага і ўвядзенне ў тэкст легенд і паданняў. Менавіта такое бачанне горада пачынае складвацца на памежжы XIX–XX стст. Расійскі літаратуразнаўца А.Я. Бабракоў-Цімошкін адзначаў: «*Большая частка твораў, што складаюць "пражскі*

*тэкст", ствараюцца ў чэшскай літаратуры на памежжы XIX–XX стст., прычынай гэтага служаць як асаблівасці гістарычнага развіцця чэшскай літаратуры, так і трансфармацыі "міфа" аб Празе ў культурнай свядомасці чэшскай нацыі»* [1, с. 325]. У гэты перыяд адбываецца станаўленне традыцыйнага для чэшскай літаратуры вобраза горада, а таму для творчасці з'яўляецца ўласцівым увядзенне гарадскіх легенд і паданняў, зварот да гістарычнага мінулага. Сам горад пераўтвараецца ў цэнтр развіцця культуры. Нездарма рускі даследчык Ю. Лотман лічыў горад «*складаным семіятычным механізмам, генератарам культуры*» [2, с. 325].

Актуалізацыя ўрбаністычнай тэмы на памежжы XIX–XX стст. стала перадумовай для зараджэння нацыянальнага бачання горада ў літаратуры. Гэтым тлумачыцца актыўны зварот чэшскіх паэтаў да вобраза горада на працягу ўсяго XX ст. Дамінантным вобраз Прагі становіцца ў творчасці аўтараў 20–30-х гг. XX ст. Некаторыя творцы і далей апісвалі дадзены вобраз у сваіх творах, аднак эвалюцыя ўрбаністычнай тэмы прасочваецца ў акрэслены перыяд. У наступныя дзесяцігоддзі аўтары або толькі часткова звярталіся да гарадской тэматыкі, або арыентаваліся на асноўныя прынцыпы 20–30-х гг. XX ст. пры адлюстраванні горада.

**Матэрыял і метады**. У якасці асноўнага матэрыялу для працы над артыкулам выкарыстоўваліся паэтычныя зборнікі Й. Горы, В. Нэзвала, Я. Сэйферта, творчасць якіх адлюстроўвае асноўныя рысы развіцця чэшскай паэзіі і ў якіх дамінантным становіцца вобраз горада, а таксама тэарэтычныя працы расійскіх даследчыкаў Ю. М. Лотмана і А.Я. Бабракова-Цімошкіна. Пры напісанні артыкула выкарыстаны наступныя метады: гісторыка-літаратурны, біяграфічны, апісальны.

**Вынікі і іх абмеркаванне**. У 20–30-я гг. XX ст. чэшская паэзія развівалася ў рэчышчы двух асноўных літаратурных кірункаў: паэтызм і сюррэалізм. Значную ролю займала і пралетарская літаратура, прадстаўнікі якой пазней сталі адэптамі паэтызму. Й. Гора і Я. Сэйферт звярталіся да вобраза Прагі і апісвалі яго праз прызму пралетарскай літаратуры. У творчасці В. Нэзвала ўрбаністычная тэма з'яўляецца частотнай у сюррэалістычны і паэтысцкі перыяды.

Для пралетарскай літаратуры характэрным становіцца адлюстраванне гарадскога асяроддзя ў цеснай сувязі з жыццём звычайных жыхароў. Аўтары паказваюць беднасць і гаротнае існаванне ніжэйшых слаёў насельніцтва. Асабліва яскрава гэта праявілася ў першым пралетарскім зборніку Я. Сэйферта «Горад у слязах» (1921): «*Пачынаецца сярод горада і вядзе ажно ў прыгараднае поле, // крута паварочваючы, // тыя, хто жывуць у ім, думаю, што не лічаць да тысячы грошы свае*» [3, s. 53]. Для пралетарскай паэзіі Й. Горы ў зборніку «Сэрца і тлум свету» (1922) уласціва адлюстраванне панурай гарадской прасторы, а таму насельніцтва горада апісваецца рэдка: «*Прыцішыла вуліца свой крок, // ці на яе ўпаў // цень электрычнага дня, які хмурыцца // у маё сэрца, у мае ногі, у мае вочы грукоча // панурая смага і пануры голад // тысяч галодных*» [4, s. 41]. Асноўны акцэнт зроблены на вобразе рук працоўнага насельніцтва, пры апісанні якіх аўтар часта выкарыстоўвае эпітэты, чым узвялічвае значнасць простых жыхароў з ускраін: «*твае сэрца шчырае і працавітую руку тваю*» [4, s. 46]. Для пралетарскай літаратуры 20–30-х гг. XX ст. стаў характэрным зварот да рэвалюцыйных падзей. Абодва чэшскія паэты бачаць паляпшэнне жыццёвага палажэння працоўных людзей у негвалтоўных рэвалюцыйных зменах, якія трансфармуюць стаўленне да ніжэйшых слаёў насельніцтва: «*Вуліцы роў, вуліцы рух // напоўніў майго пакою паветра // рукі паўстання кінулі маё жыццё // у палітычны грукат грому*» [4, s. 13]. У Я. Сэйферта ў творах гэтага перыяду чалавек супрацьпастаўляецца фабрыцы, дзе ён працуе. У зборніку «Горад у слязах» аўтар выкарыстоўвае адухаўленні з адмоўнай канатацыяй у дачыненні да завода, што ўзмацняецца сінекдахай: «*той завод ужо аднак сам сябе праклінае і вінаваціць // пасярод тысячы сэрцаў*» [3, s. 55]. У сваім зборніку Й. Гора таксама выкарыстоўвае эпітэты з адмоўнай канатацыяй пры апісанні прамысловых ускраін: «*З прыгарада прамысловага, які апяваў // мой прыяцель С. К. Нэйман, яго жыхар, // мяне везла аўтаматрыса па цёмнай вуліцы*» [4, s. 24].

У паэтысцкай паэзіі эстэтычная функцыя літаратуры спалучаецца з займальнай: «*Паэзія выступае тут у якасці гульні, якая пераадольвае ўсталяваныя традыцыі праз захапленне рэчамі вакол нас, моўныя гульні, экзотыку, спалучэнне разнастайных колераў*» [5, с. 192]. Нягледзячы на гэта, урбаністычная тэма займае значнае месца ў вершах паэтыстаў. Асаблівасць адлюстравання гарадской прасторы ў гэтых творах заключаецца ў тым, што аўтары звяртаюцца да замежных гарадоў, робячы іх асноўным месцам дзеяння. Так, у паэме В. Нэзвала «Эдысан» (1927) апісваецца горад Нью-Ёрк, згадваюцца значныя гарадскія лакацыі: «*Аднойчы крочыў па Нью-Ёрку авантурыст // быў поўдзень з цёплым сонцам у маі // пешаход спыніўся моўчкі на Брадвеі // перад палацам тэлеграфа Вэст Юніон // дзе ўсё гуло як на размеркавальным шчыце // гэта быў газетчык і вялікі вынаходнік*» [6, s. 108]. У паэтысцкім зборніку «Паштовы голуб» (1929) Я. Сэйферт захапляецца французскай сталіцай і ўзнаўляе яе памятныя мясціны: «*быў аднак люстэркам, // у ім і сёння гараць ліхтары бульвараў, твар ганарлівы, Парыж!*» [4, с. 21]; «*пахавальная працэсія прасоўваецца // па бульварах на Монпарнасе*» [7, с. 30].

Адлюстраванне гарадскога асяроддзя становіцца важнай часткай сюррэалістычнай паэзіі, паколькі аўтары мелі ў асноўным гарадское паходжанне і былі пазбаўлены кантакту з прыродай [8, с. 147–148]. У сюррэалістычным зборніку В. Нэзвала «Прага з пальцамі дажджу» (1936) чэшская сталіца становіцца не толькі асноўным месцам дзеяння, але з'яўляецца дамінантным вобразам усяго зборніка. Тлумачыцца гэта тым, што «*можна разглядаць сюррэалізм як мастацтва вялікага горада, як адлюстраванне сучаснага стылю жыцця*» [8, с. 148]. У вершах часта ўзгадваюцца пражскія вуліцы, што аднаўляе рысы горада ў свядомасці чытачоў: «*Выйшаў з Козі вулачкі там дзе перакрыжаванне аўтобусаў Пэтрскай плошчы і ночы*» [9, s. 44]; «*Шэсце мяне бярэ з сабой пойдзе да Рыцірскай вуліцы // Ці будзеш блукаць па Фруктовым рынку*» [9, s. 53]; «*Пасля з'явіўся зноў на рагу Тругларшскай вуліцы*» [9, s. 62]. Значную частку займае апісанне побыту звычайнага гарадскога насельніцтва, аднак В. Нэзвал не згадвае жыхароў, звяртаючыся да сінекдахі: «*Вечар праца спынілася і горад танцуе*» [9, s. 13]; «*Кашулі гальштукі стаім перад хімчысткай // Прага ляскоча як кашолачніца*» [9, s. 57]. Такім чынам ён непасрэдна акцэнтуе ўвагу на жыцці горада, што адрознівае яго адносіны да гарадской прасторы ад погляду прадстаўнікоў пралетарскай літаратуры.

**Заключэнне.** Урбаністычная тэма становіцца адной з дамінантных у чэшскай паэзіі першай паловы XX ст. Да горада звярталіся прадстаўнікі розных эстэтычных кірункаў і плыней. Галоўным чынам ён быў увасоблены ў пралетарскай, паэтысцкай і сюррэалістычнай літаратуры.

Падабенства ў апісанні горада і яго жыцця выяўлена ў тым, што гарадская прастора становіцца асноўным месцам дзеяння ў паэтычных творах. Аўтары ўсіх трох кірункаў адлюстроўваюць побыт звычайных працоўных жыхароў, паказваючы змены, што прыўнесла ў гарадское жыцця навукова-прамысловая рэвалюцыя.

Змены ў стаўленні да горада і пэўная эвалюцыя ў адлюстраванні гарадской прасторы бачыцца ў тым, што ў пралетарскай літаратуры аўтары дастаткова часта выкарыстоўваюць эпітэты з адмоўнай канатацыяй пры апісанні гарадской прасторы. Звязана гэта са знішчэннем асобы чалавека і пераўтварэннем яго ў працоўную сілу, якая абслугоўвае фабрыкі і заводы. У паэтысцкі перыяд урбаністычная тэма адлюстравана пры апісанні замежных гарадоў, паколькі сам кірунак патрабаваў ад творцаў звароту да экзатычных і чужаземных матываў. Ужо ў перыяд сюррэалізму горад становіцца арганічнай часткай паэзіі і асноўным месцам дзеяння твораў. Параўнанне творчасці трох слынных чэшскіх паэтаў дазволіла пераканацца ў эвалюцыі вобраза горада, а таксама адзначыць актыўны зварот да гарадской тэмы ў чэшскай паэзіі XX ст.


1. Бобраков-Тимошкин, А. Е. «Пражский текст» в чешской литературе конца XIX – начала XX веков: автореф. дис. ... канд. фил. наук: 10.01.03. Москва: МАКС-Пресс, 2004. – 18 с.

2. Лотман, Ю. М. Семиосфера / Ю. М. Лотман. – С.-Петербург: «Искусство–СПБ», 2000. – 704 с.

3. Seifert, J. Město v slzách; Samá láska; Svatební cesta; Slavík zpívá špatně; Poštovní holub / Jaroslav Seifert. – Praha: Československý spisovatel, 1989. – 261 s.

4. Hora, J. Srdce a vrava sveta / Josef Hora. František Borový: Praha, 1929. – 66 s.

5. Шлемен, Ю.А. Ярраслаў Сэйферт як прадстаўнік чэшскага паэтызму / Ю.А. Шлемен // Сборник научных статей студентов, магистрантов, аспирантов. Вып. 29 / БГУ, факультет международных отношений [Электронный ресурс]; / сост. М.Д. Липницкая; [под общ. ред. Е. А. Достанко]. – Минск: Четыре четверти, 2022. – С. 191–193.
6. Nezval, V. Edison / Vítězslav Nezval. – Praha: Českosl. spis., 1982. – 120 s.
7. Seifert, J. Město v slzách; Samá láska; Svatební cesta; Slavík zpívá špatně; Poštovní holub / Jaroslav Seifert. – Praha: Československý spisovatel, 1989. – 261 s.
8. Пинковский, В.И. Жанровые воплощения образа человека в поэзии сюрреализма / В.И. Пинковский // Знание. Понимание. Умение. – 2007. – № 4. – С. 141–148.
9. Nezval, V. Praha s prsty deště / Vítězslav Nezval. František Borový: Praha, 1936. – 202 s.

## НЕОЧЕЛОВЕК В РОМАНЕ М. УЭЛЬБЕКА «ЭЛЕМЕНТАРНЫЕ ЧАСТИЦЫ»

***Щербина А.О.,***
*ВГУ имени П.М. Машерова,*
*г. Витебск, Республика Беларусь*
*Научный руководитель – Гладкова А.А., канд. филол. наук, доцент*

Ключевые слова. Мишель Уэльбек, научная фантастика, авторское осмысление, неочеловек, технический прогресс.
Keywords. Michel Houellebecq, science fiction, author's interpretation, neohuman, technological progress.

Мишель Уэльбек – французский писатель, известный критической позицией по отношению к современному обществу. Его творчество посвящено порицанию технократического общества, разрушающего моральные устои и ценности человека, и искажающего духовные и нравственные ориентиры. Его роман «Элементарные частицы» положил начало пути автора к мировой славе и вызвал смешанные мнения у критиков и читателей. М. Уэльбек изобразил картину общества, страдающего от морального и духовного упадка, и в очередной раз заставил задуматься о судьбе человечества.

Название «Элементарные частицы» Уэльбек объясняет парадоксально, утверждая, что *«человек как элементарная частица»* представляет собой *«одну из клеток общества, которые между собой не связаны»* [5]. Роман представляет собой глубокий анализ современного общества, где автор исследует темы одиночества, трудностей общения и влияние научных достижений и технологий на жизнь человека. Уэльбек показывает, как прогресс в науке меняет повседневность людей, ставя под угрозу моральные и этические ценности, и описывает общество, в котором технологии вытесняют человеческие связи, а поиск смысла жизни сводится к удовлетворению материальных потребностей. В этом контексте концепция «неочеловека» играет ключевую роль в понимании идеалов и угроз, возникающих в результате генетических манипуляций и трансформаций человека, а также поднимает вопросы, касающиеся человеческой сущности, природы отношений в эпоху научных достижений.

Актуальность темы обусловлена необходимостью изучить концепцию неочеловека в романе Мишеля Уэльбека «Элементарные частицы». Цель данной работы – изучение авторского осмысления концепции неочеловека в контексте технологического прогресса как основных тем романа «Элементарные частицы».

**Материал и методы.** Материал исследования – роман Мишеля Уэльбека «Элементарные частицы» и соответствующий ему русскоязычный перевод, представленный И. Васюченко. В работе применяются следующие методы исследования: описательно-аналитический, метод контекстного анализа.

**Результаты и их обсуждение.** Мир «Элементарных частиц» отражает разочарование Уэльбека в современном французском обществе, автор изображает цивилизацию, утратившую нравственную ответственность. *«Контрастность социально-экономических, научно-технических, политических и философских движений по-своему сказалась в особой разнонаправленности творческих исканий в литературном процессе Франции»* [3]. В этой реальности аморальное поведение и бездумные поступки становятся нормой. Автор по-